баму жыццёваму і чытацка-інтэлектуальнаму вопыту пісьменніка. «Караткевіч свядома запазычвае пэўныя знаходкі японскага майстра слова. Аднак запазычанні гэтыя носяць метафізічны, метанаратыўны характар і зяўляюцца свайго роду інтэрпрэтацыйнымі маркерамі для творчых пошукаў беларускага пісьменніка». Для К. і А. ключавым аспектам літар. творчасці, сутнаснай характарыстыкай літар. твора з'яўляецца даследаванне, аналіз псіхалогіі. Пры гэтым ні А., ні К. не бяруць у якасці абектаў псіхалагічнага аналізу маштабныя падзеі, яны даследуюць унутр. свет чалавека праз, на першы погляд, малазначныя здарэнні.

*Літ.*: Мальдзіс А. Жыццё і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча: партрэт пісьменніка і чалавека. Мінск, 1990; Навіцкая В. Творчасць Уладзіміра Караткевіча-празаіка: стратэгіі мадэлявання рэчаіснасці. Мінск, 2019.

*А.І.Левіціна.*



*Мемарыяльная сядзіба* ***Альбуць.***

**АЛЕЙНІК** Барыс Ільіч (1935—2017), украінскі паэт, перакладчык. Акад. НАН Украіны (1990). Герой Украіны (2005). Скончыў Кіеўскі ўн-т (1958). Аўтар зб-каў вершаў «Стаю на зямлі» (1973), «Сівая ластаўка» (1979), «У люстры слова» (1981) і інш. Перакл. на



*Б.І.***Алейнік.**

ўкр. мову асобныя творы бел. паэтаў (Г.Бураўкіна, Н.Гілевіча, А.Куляшова). Дзярж. прэмія СССР 1975. Дзярж. прэмія Украіны імя Т.Шаўчэнкі 1983. Прэмія Ленінскага камсамола УССР імя М.Астроўскага 1964. Міжнар. прэмія імя Г.Скаварады 1994.

З К. пазнаёміўся пасля вер. 1953, калі пачаў вучыцца на аддзяленні журналістыкі філал. факультэта Кіеўскага ўн-та імя Т.Шаўчэнкі і пасяліўся ў тым жа інтэрнаце ў Кіеве па вул. Асветы, дзе тады жыў і будучы пісьменнік. К. згадвае А. ў эсэ «Мой се градок!» у ліку сваіх сяброў-аднадумцаў, з якімі разам «вырашалі светавыя праблемы», «швэндаліся вулкамі і заўзята спрачаліся аб паэзіі, праўдзе, любові да радзімы і проста любові і зноў, зноў аб паэзіі».

*С.А.Галоўка.*

**АЛЬБУЦЬ**, мемарыяльная сядзіба — філіял Дзяржаўнага літар.-мемар. музея Якуба Коласа ў Стаўбцоўскім р-не Мінскай вобл. Размешчана за 5 км ад г. Стоўбцы ў доме лесніка, дзе ў 1890—1904 жыла сям'я Міцкевічаў. Тут прайшлі дзяцінства і юнацтва Я.Коласа, тут ён напісаў свой першы верш.

К. наведваў А. летам 1974 разам з Д.Міцкевічам, старэйшым сынам Я.Коласа і тагачасным дырэктарам Літар. музея Я.Коласа, славацкай пісьменніцай Г.Крыжанавай-Брындзавай, польск. літ.-знаўцам Ф.Фарнальчыкам, бел. паэтам Р.Барадуліным, літ.-знаўцам А.Мальдзісам і членамі іх сем'яў. На той час А. яшчэ не была музейным аб'ектам, але туды ладзіліся экскурсіі. Д.Міцкевіч расказаў пра альбуцкі перыяд жыцця нар. песняра, паведаміў, што ў паэме «Новая зямля» А. апісана як Парэчча. Усе былі ў захапленні ад хараства навакольнай прыроды. Паводле ўспамінаў А.Мальдзіса, «Валодзя [Караткевіч] паказваў гасцям розныя расліны, прыводзіў іх беларускія і лацінскія назвы, пытаў, як яно будзе па-славацку і па-польску, і цешыўся, калі знаходзіў нейкую сугучнасць. Тады ж выказаў думку, што ўсе мы, літаратары, недаацэньваем ролю народнага самародка дзядзькі Антося ў станаўленні творчай індывідуальнасці Якуба Коласа («ён жа адкрываў яму, мяркуючы па «Новай зямлі», вочы на хараство»)».

*С.А.Галоўка.*

**АМЕЛЬЧАНКА** Мікалай Міхайлавіч (1930—2000), украінскі пісьменнік, сцэнарыст. Скончыў Вышэйшыя сцэнарныя курсы ў Маскве (1962). Працаваў у прэсе, на Кіеўскай кінастудыі імя А.Даўжэнкі, у Дзярж. к-це кінематаграфіі Украіны. Аўтар аповесці «Першая навігацыя» (1974), раманаў «За ўсё ў адказе» (1976), «Серая мыш» (1988), сцэнарыяў маст. і дакумент. фільмаў.

Сябраваў з К., вучыліся разам на Вышэйшых сцэнарных курсах у Маскве. Апошняя іх сустрэча адбылася пасля смерці Валянціны Браніславаўны, жонкі К., у 1983 ці 1984. Пісьменнік наведаў свайго таварыша на яго дачы ў Ірпені (Бучанскі р-н, Кіеўская вобл., Украіна). А. — аўтар успамінаў пра К. «Кароль Духоўнасці» (у час. «Полымя», 1999, №12), у якіх прыводзіць згадкі пра час вучобы ў Маскве.

*С.А.Галоўка.*

**АМЕРЫКАНСКІ ГІСТАРЫЧНЫ РАМАН І УЛАДЗІМІР КАРАТКЕВІЧ.** Гіст. раманы К. жанрава падобныя да гіст. раманаў амерыканскіх пісьменнікаў 19—20 ст. (Н.Готарна, А.Херві і інш.). У л-ры ЗША вял. развіццё атрымаў рамант. раман (побач з традыц. раманам), у прыватнасці, у рэчышчы гіст. рамана, які ўзнік у 1920-я г. як перамога рэалізму ў л-ры. Да жанру рамант. рамана можна аднесці і твор К. «Каласы пад сярпом тваім».

Амерыканскі гіст. раман 1920—30-х г. падкрэслена пацыфісцкі. Аўтары гіст. раманаў пра грамадз. вайну ў ЗША (М.Кентар, Х.Ален) адмаўляюцца ад глыбокага сац. аналізу яе

прычын і характару і трактуюць як трагедыю, роўную для абодвух бакоў. Амерыканскаму гіст. раману аб грамадз. вайне ўласціва агульначалавечая маральная накіраванасць, калі пытанне гіст. правоты таго ці інш. боку адступае на другі план перад выяўленнем жахлівай сутнасці любой вайны, перад развянчаннем яе як сродку вырашэння паліт. канфліктаў, што забяспечвае высокі маральны патэнцыял амерыканскага гіст. рамана 20 ст.

Гіст. раман «Каласы пад сярпом тваім» К. прысвечаны падрыхтоўцы бел.-польск. дваранства да паўстання 1863—64. Але шырокай панарамы падзей, жыцця Паўн.-Зах. краю ў рамане няма. Гэта тыповы раман выхавання, і гіст. рэчаіснасць узнаўляецца ў ім праз успрыманне яе сталеючым Алесем Загорскім, адным з будучых удзельнікаў і кіраўнікоў паўстання, сябрам Кастуся Каліноўскага. Незадаволенасць бел. і польск. дваранства, выспяваючая ідэалогія паўстання паказаны ў рамане з дапамогай рэканструкцыі і тонкага псіхалагічнага аналізу свядомасці героя, фарміравання асобы будучага князя Загорскага, сістэмы яго поглядаў. Твор рамантычны па духу апавядання. Аўтар абрывае яго ў той момант, калі варта было б перайсці да непасрэднага апісання гіст. падзей 1863. Прынцып адлюстравання гісторыі ў «Каласах...» цалкам




*Да арт.* ***Амерыканскі гістарычны раман і Уладзімір Караткевіч.*** *Вокладка кнігі «Дзікае паляванне караля Стаха».*

адпавядае прынцыпам малюнка гіст. падзей у амерыканскім гіст. рамане наогул, дзе гіст. падзеі заўсёды знаходзяцца «за кадрам» і паказаны толькі праз уплыў іх на лёсы людзей, якія насяляюць раманную прастору.

Развіццё амерыканскага гіст. рамана ў 20 ст. было адзначана таксама і ростам цікавасці да гіст. фактаў, імкненнем надання яму большай важнасці, абвяшчэння гіст. праўды гал. мэтай і мерай вартасці гіст. рамана, насычэння яго дакументамі. Пад гіст. праўдай маецца на ўвазе дакумент. дакладнае адлюстраванне гіст. падзей, а таксама дакладнасць гіст. дэталей, узнаўленне інтэлектуальнай і эмац. атмасферы апісанай эпохі. У 1960—70-я г. цікавасць да дакументалістыкі ў амерыканскіх прадстаўнікоў гіст. жанраў была падмацавана развіццём дакумент. прозы і ўзрастаннем фактаграфічнасці л-ры, выхадам на літар. арэну пісьменнікаў, якія бачылі сваё маст. заданне ў стварэнні раманаў-дакументаў (Эйджы, Херсі, Капотэ, Вульф, Уэмба, Тэліз, Уікер, Брайан і інш.). У 20 ст. ў значнасці факта, дакумента пераконваюць чытача амаль усе гіст. раманісты (М.Кентар, Гетысберг, А.Херві і інш.). Прыхільнасць да факта, дакумента знаходзіць выражэнне не толькі ў дакумент. дакладнасці ўзнаўлення падзей, але і ў знешняй форме твора, якая ўсё больш уяўляе сабой збор дакументаў (Г.Фаст, Р.Фаўлер, Ч.Бауэр, М.Шаары, Л.Окінклоса і інш.).

Тыя ж тэндэнцыі назіраюцца і ў развіцці гіст. рамана ў інш., вельмі адлеглых адна ад адной у геапаліт. дачыненні краінах, у т.л. і бел. гіст. рамана. Яркі прыклад — эвалюцыя маст. метаду К., які стварыў рамант. раман «Каласы пад сярпом тваім» пра бел.-польск. дваранства напярэдадні і ў паўстанні Каліноўскага. Пісьменнік планаваў стварыць працяг рамана, але завяршыў рамант. гісторыю дакумент. гіст. сачыненнем «Зброя». Гіст. раман К., з'яўляючыся часткай агульнага літар. працэсу, увабраў у сябе ўсе асаблівасці гіст. рамана 20 ст.

У 2013 у выд-ве «Glagoslav Publications» была выдадзена аповесць «Дзікае паляванне караля Стаха» К. ў перакладзе на англ. мову.

*Т.Я.Камароўская.*

**АНДАРАЛА** Галіна Фёдараўна (н. 1951), беларускі педагог. Скончыла Мінскі пед. ін-т імя М.Горкага (1976). У 1976—87 настаўнічала ў Мінску. З 1990 у Бел. пед. ун-це. Аўтар навук. артыкулаў па пытаннях узаемадзеяння і ўзаемапранікнення моў і культур, патрыятычным выхаванні школьнікаў сродкамі маст. л-ры і інш.

У арт. «Архаізмы і іх стылістычная роля ў гістарычных творах У.Караткевіча» (зб. «Гістарычнае мовазнаўства ў кантэксце міждысцыплінарных даследаванняў», 2017) А. зазначае, што К. быў «першым, хто ўсвядоміў, што, каб зразумець таямніцу беларускага народа, яго веліч, неабходна добра і глыбока пазнаць яго мінулае, трагічныя і творчыя эпохі, у якія фарміраваўся беларускі характар». На думку А., зварот К. да гісторыі — гэта не спроба адысці ад пытанняў сучаснасці, а «жаданне лепш зразумець іх, усвядоміўшы гістарычную заканамернасць, глыбей асэнсаваць сённяшняе ў ланцугу шматвекавой гісторыі роднай Беларусі».

*А.І.Левіціна.*

**АНДРАЮК** Серафім Антонавіч (н. 1933), беларускі крытык, літаратуразнавец. Засл. работнік культуры Беларусі (1993). Канд. філал. навук (1966). Скончыў БДУ (1957). З 1981 гал. рэдактар, у 1993—96 дырэктар выд-ва «Мастацкая літаратура». Даследуе гісторыю бел. л-ры і сучасны літар. працэс. Аўтар манаграфій «Жыццё. Літаратура. Героі» (1973), «Традыцыі і сучаснасць» (1981), зб-каў крытычных артыкулаў «Вывяраючы жыццём» (1976), «Жыць чалавекам» (1983), кн. «Стыль пісьменніка» (1974).

Аўтар рэцэнзій на раман К. «Каласы пад сярпом тваім» — «Трагедыя і слава» («Маладосць», 1969, №11), на апавяданне «Чазенія» — «На рамантычнай хвалі» («Полымя», 1971, №5). Чл. рэдакцыйнай калегіі Зб. тв. К. ў 8 т. (1987—91), рэдактар 2-га т. (Аповесці, апавяданні, казкі, 1988). У 1980 у юбілейным артыкуле, змешчаным у газ. «Чырвоная змена», пісаў: «Пра што б ні пісаў Караткевіч, у якім бы жанры ні выступаў (а ён жа і празаік, і паэт, і драматург, і аўтар шматлікіх эсэ, і нарысіст), заўсёды творы ягоныя напоўнены вялікай любоўю да роднай зямлі, яе людзей. Уся творчасць пісьменніка — гэта своеасаблівая песня пра Беларусь, песня сапраўды народнага, эпічнага размаху, глыбокага драматызму і высокага паэтычнага ўзлёту».

*Літ.:* М а л ь д з і с А. Жыццё і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча: партрэт пісьменніка і чалавека. Мінск, 1990.

*А.М.Ненадавец.*

**АНЕЛІН**, былы маёнтак. Знаходзіўся на сучаснай тэр. Астравецкага р-на Гродзенскай вобл., па паданнях — на скрыжаванні дарог (адна — з А. на Расолы, другая — з Палушаў на Лошу, Шумск